№29, красавік 2022 ISSN 2562-950

**Валеры Грыцук: Ці згубілі мы Беларусь? (*адказ тэарэтыкам*) або Гістарычны нарыс XX стагоддзя – цараваньне дыктатара-калгасніка**

Анатацыя. Паважаны Чытач! 27 год насельніцтва РБ спала «Фабрыка сноў» (UltraВожык), сьмялася з Апазіцыі, НЕ хацела чытаць-слухаць Апазіцыю. І, «белорусы» маюць моцны «ген» раба. Але і раб павінен ДУМАЦЬ. НЕ ДУМАЛІ. Я прапаную ТЭЗІСЫ разьвіцця падзей у РБ. Падрабязней ёсьць у «Маё змаганьне» (kamunikat.org) 2020. Сітуацыя крыху палепшылася... Але, рабочыя НЕ страйкавалі – доказ: рабы засталіся рабамі. Выснова: рабам не патрэбна Разуменьне. Таму, мае тэзісы для інтэлектуалаў, людзей якія ДУМАЮЦЬ, прагненьне якіх накіравана на пабудову БЕЛАРУСІ беларускай, дэмакратычнай, з рэальнымі Правамі Чалавека. Я паказваю памылкі «лідэраў» Апазіцыі, падкрэсліваю, што НЕжаданьне Апазіцыянераў працаваць на змены праз самаахвярнасьць НЕ даюць поспеху. Кніга «Маё змаганьне» (і справаздача дэпутата) паказвае: штодзённай працай з (і ДЛЯ) насельніцтвам можна дасягнуць падтрымкі нават апанентаў. Адпаведна, я маю права на жорсткі аналіз дзейнасьці лідэраў Апазіцыі, але толькі праз факты. «Нарыс» напісаны тэзісна – не для гультаёў. Маем Інтэрнэт, незалежныя СМІ – усё можна знайсьці, калі ёсьць гнасеялагічны імпэт. Існаваньне Інтэрнэта «пазбавіла» большасьць людзей чытаць кнігі. Зараз Інфармацыя, Аналіз павінны будавацца ў выглядзе «дрэва». Можна даваць спасылкі, ці спадзявацца, што чытач сам знойдзе дадатковую інфармацыю. На маю думку, інтэлектуальнае гультайства (не думаць) - самая нябеспечная з’ява.

*Індывідуум можа быць шчаслівым – толькі калі ён пабудуе дэмакратычную дзяржаву; для Беларусаў, менавіта, Беларускую.*

Паважанае спадарства! Гэты нарыс не пра дыктатара. Аляксандр Лукашэнка, тыповы калгасны раб (“из грязи да в князи”) паказаў, што ён можа быць Тэарыстам ... Адпаведна, пасля гэтага няма сэнсу апісваць ягоны характар і ягоныя брутальныя незаконныя дзеяньні. У артыкуле я раблю спробу паказаць другога «актора» на палітычнай сцэне Беларусі: “народ”. “Апазіцыя” - таксама “народ”, больш таго: ЯКІ НАРОД – ТАКАЯ і АПАЗІЦЫЯ. Гэты нарыс – не храналогія, бо я раблю аналіз сітуацыі і паводзін «актора».

Чаму гэта таксама адказ «тэарэтыкам»? Найбольш менавіта яны «тэарэтыкі-эксперты» мяне раздражняюць максімальна. Гэтыя голыя тэарэтыкі: Сяргей Богдан, Пікулік (у Лондане) і шмат іншых, існуючых з замежных «грантаў», анічога РЭАЛЬНАГА не зрабілі са сваіх цёплых месцаў ў Эўропе (як і «белорускія»), каб дапамагчы Апазіцыі абудзіць беларусаў. Наадварот, шмат хто з іх «дзяўблі»

рэальную Апазіцыю. Да прыкладу, голы тэарэтык Сяргей Богдан раптам заенчыў, што пратэсты Беларусаў ў 2020 годзе вядуць да згубы Беларусі. Астатнія не лепш.

Я прачытаў многія тэксты «інтэлектуалаў» адносна падзей 2020-га на Радыё Свабода. Большасць адзначаюць, што «НАРОД АБУДЗІЎСЯ – прачнуўся»... Так, і я згодны. Але гэтая абуджэньне пасля 26-гадовай «спячкі», можна нават параўнаць з нараджэньнем дзіцяці: і там кроў, і тут кроў... А чаму так атрымалася, што словы Янкі Купалы «ЛЮДЗЬМІ ЗВАЦЦА» загучалі для абсалютнай большасьці беларусаў толькі ў 2020-м? Дарэчы, гэтае «ЛЮДЗЬМІ...» трэба чытаць: “МЫ МАЕМ ЧАЛАВЕЧУЮ ГОДНАСЬЦЬ”. Але трэба памятаць і іншыя словы сапраўднага Беларуса - Янкі Купалы: “*Дурны мужык як варона».*[1] Так, бо НЕжаданьне разумець сітуацыю дваццаць шэсць год і ёсьць дурната! Дык вось, я хачу тут тэзісна паказаць прычыны існаваньня гэтага дурнога мужыка, які «не варушыўся 26 год», то бок большасьці беларусаў, і задаць ім непрыемнае пытаньне:«***А дзе вы былі раней?!»***

Для пачатку нагадаю, што беларусы такі ўзгадалі, што яны таксама маюць права бараніць ГОДНАСЬЦЬ чалавека, якая павінна быць і ў беларусаў. Дык вось: ці можна было абудзіць, а можа, нават, «прышчапіць» ГОДНАСЬЦЬ большасці беларусаў раней? Давайце абмяркуем гэта паводле галоўных магчымых крыніц беларускіх праблемаў (нехта можа сказаць: «*Не час на пошук вінаватых»*... Але, ці не атрымаецца так, што «новая Апазіцыя» зацыкліцца на «проектах» і спакойным жыцці ў Эўропе?): І.Генатып беларусаў; ІІ. “Інтэлігенцыя”; ІІІ. Апазіцыя; ІV. Неўрадавыя арганізацыі; V. Чынавенства; VІ. Грамадзяне РБ на Захадзе; VІІ. Журналісты; VІІІ. Расея; ІХ. Захад; Х. “Лоббінг».

**І. Генатып беларусаў ---- які ЁН ?**

Генатып складаецца з асобных “генаў”, якія, у сваю чаргу, адказныя за канкрэтныя ўласьцівасьці (згадзімся «апрыёры»).[2] Некаторыя кажуць, што мы, Беларусы, падобны на шведаў... Магчыма. АЛЕ! Шведы НІКОЛІ не былі пад акупацыяй агрэсара – самі былі акупантамі. А нашы продкі пасля забароны нашай Мовы ў 1696 годзе і да сёньня жылі пад акупацыяй, то бок, у няволі. У выніку ў беларусаў з‘явіўся «**ГЕН РАБА»**. Самае простае яго дзеяньне: вялікая ПАВАГА да НАЧАЛЬНІКА! Што мяжуе нават са страхам! Але гэты ген можна душыць. Але цяжкая спадчына:

---

[1] [Але «мужык» дурнейшы за варону. Я бачыў як варона кідала арэхі на асфальт, каб яны разбіліся...]

[2] Навука паказала , што генатып Беларусаў вельмі блізкі да палякаў, і далей ад т.з. «русских» (то **не** звесткі ад НАН РБ - лукашыстам нельга верыць). Псіхолагі і генетыкі зрабілі выснову, што гены толькі на 50% кіруюць чалавекам. Моцныя людзі могуць нават душыць гэта ген... Але «душыць ген» - гэта значныя высілкі – не для «Абыякавых»!

300 год рабства («прыгон»), 300 год афіцыйнай забароны Беларускай Мовы (былі, праўда, «акенцы»), 300 год знішчэньня нацыянальнай эліты далі «вынік»: ад раба нараджаецца раб...

**II. "Інтэлігэнцыя"**

Сярод людзей, якія лічаць сябе «интеллигентами» ... яшчэ больш рабоў чым сярод «простых». Калі "большевики" на чале з цмокам Сталіным знішчылі 97% беларускіх адукаваных людзей ... то ў выніку **ад РАБА НАРАДЖАЕЦЦА РАБ!** Дыктатары, перад усім Б'ЮЦЬ па Беларускіх інтэлектуалах - Розуму Нацыі. Дыктатар-тэрарыст Лукашэнка забараніў Таварыства Беларускіх пісьменьнікаў, прызначыў «КГБ-ста» кіраўніком Нацыянальнай Акадэміі Навук, і г.д. «Інтэлігенцыя» не пратэставала! Зразумела ўсё ж, што ёсць некаторыя інтэлектуалісты-Беларусы, якія робяць важныя справы для Беларусі - «Універсітэт Лятучы», гістарычныя артыкулы і г.д. Выснова: Беларусь не мае інтэлігэнцыі (на 95%), але мае асобных інтэлектуалаў-Беларусаў.

**III. Апазіцыя**

Толькі ФАКТЫ! Апазіцыя, то бок, сапраўдныя БЕЛАРУСЫ, пачалі губляць Беларусь ад 1992 года, калі не абаранілі Рэфэрнэдум (галоўная віна была на **БНФ як арганізацыі** на чале з Пазьняком). Але і «падпісанты» не пратэставалі! (*гэты рэферэндум, за правядзеньне якога было сабрана 450.000 подпісаў, і які планаваўся на 6 сьнежня 1992 года, не адбыўся, рэд.*).

**1994 год.** Апазіцыя, перадусім БНФ, праз суперамбіцыі З.Пазьняка, згубіла шанец падтрымаць НЕрасійскага кандыдата-Беларуса сп.Карпенку і перамагчы расейскіх агентаў. Капіяваньне балтаў – памылка З.Пазьняка. Насельніцтва БССР і ў 1994 годзе было вельмі «просоветское».

Вялізарнай памылкай Пазьняка (і пазьнякоўцаў дэпутатаў) была неразуменьне правакацыі Віктара Ганчара, калі галасавалася папраўка ў Канстытуцыю па узросту для кандыдата на пасаду Прэзідента РБ - 40 гадоў. Ганчар заявіў: ***"Вы што Лукашенко боитесь?"*** Нават з чыста з псіхалагічных пазіцый 35 гадоў для Прэзыдэнта дзяржавы (нават зараз) – гэта дрэнна. Прыкладаў дастаткова.

Так, пазьнякоўцы вельмі крытыкавалі «Канстытуцыю пад Кебіча» ... Але «Канстытуцыя» з'явілася з шэрагам дэмакратычных нормаў. Яе трэба была абараняць ... Старшыня Дэпутацкага Клуба «Дэмакратычных рэформаў» г.Менска (Валеры Грыцук) абвясціў «Ініцыятыву - *Абараняем Канстытуцыю"* ужо ў сакавіку 1994 года. Ёсьць гэта ў кнізе М. Грыба, былога Старшыні ВС. НІХТО з дэмакратаў

НЕ падтрымаў гэты заклік. Толькі на пачатку 1996 года «ОГП» «вярнулася» да гэтай ініцыятывы, але хутка «згасла». Але ўжо лістапад 1996 года паказаў, хто меў рацыю.

**1995 год.** Апазіцыя (ПАРТЫІ і NGOs) адмовілася ад агітацыі СУПРАЦЬ НЕЛЕГАЛЬНАГА «рэферендума». Мінімум – была магчымасьць ЗАХАВАЦЬ БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ СЬЦЯГ і «ПАГОНЮ», можа нават і Беларускую Мову. Лёсавызначальная ПАРАЗА беларускіх дэмакратаў пад час *«Референдума Президента»*!!! Пасля жніўня 1995 года я спыніў сваё сяброўства ў БНФ (*«пакуль там Пазьняк»)*. Дэлегаты 2-х з'ездаў БНФ (1995), моцна мяне абразілі – не захацелі мяне выслухаць. Але Гісторыя паказала, што я меў рацыю.

**1996 год.** Абсалютна неэфектыўны пратэст БНФ супраць нежаданьня агентаў «ФСБ» у Канстытуцыйным Судзе дзейнічаць згодна з Канстытуцыяй Беларусі. Тысячы Беларусаў павінны быць каля будынка КС, а не на плошчы Леніна. Кіраўнікамі БНФ былі літаратар Баршчэўскі і лінгвіст Вячорка. Зянон Пазьняк паказаў няздольнасьць кіраваць БНФ праз факсы. Больш таго, ён не зразумеў дзе робіцца палітыка. С.Навумчык ва ўспамінах напісаў, што Пазьняк напісаў лісты да старшыні ВС Шарэцкага. Што!? Няўжо Пазьняк не ведаў рабскасьць Шарэцкага? Гэты «Старшыня» паказаў сябе маскальскім рабом праз запрашэньне ў Беларусь «хозяев»-маскалёў. Калі пісаць, то трэба была пісаць Старшыні КС Ціхіню ... Магчымасьць дацісныць Канстытуцыйны Суд была (галасавалі амаль «50 на 50»). Але іншых апазыцыйных сілаў, акрамя БНФ, НЕ было***.[3] Больш таго, некаторыя потым вялі патаемны гандаль з Лукашэнка.

1996 год быў працягам паразы апазіцыі ў 1994-1995гг. Паводле С.Навумчыка выбары ва «Уруччы» ў 1995 г. выйграў артадаксальны камуніст. Гэта здарылася таму, што мне «БНФ»\Пазьняк забараніў (!!!) быць там кандыдатам (менавіта ў гэтым рэгіёне я арганізаваў пераможныя выбары для З.Пазьняка ў 1994г. і відавочна перамог бы камуніста і быў бы адзіным дэпутатам БНФ у ВС бо цалкам кантраляваў там галасаваньне).

**1997-1998гг.** Апазіцыя спала.

**1999 год. Год страха апазыцыйных лідэраў.** «Эскадрон смерти», які стварыў яшчэ законны Прэзідент Лукашэнка, забіў былога Міністра ўнутраных спраў Ю.Захарэнку.

1999 год быў перадумовай паразы ў 2001 годзе. Год быў адметны тым, што В. Ганчар, былы галоўны памагаты дыктатара Лукашэнкі, вырашыў адпомсьціць

[3] на сёньня тыя суперамбітныя лідэры іншых партый маюць «праблемы», таму я не называю іх прозвішчы

“хаўрусніку” і арганізаваў альтэрнатыўныя выбары Прэзыдэнта.Так! Нават выбарчыя камісіі былі створаны. Але апазіцыя, фактычна не падтрымала ініцыятыву Ганчара. Ганчар угаварыў быць «кандыдатамі» Чыгіра (былога старшыню ўрада) і звышамбітнага З.Пазьняка!!! Але ў неспрыяльных умовах: «народ» маўчыць, лідэры апазіцыі зашыліся ад страху «ў бульбу»... «Ганчароўскія выбары» - выбары Прэзыдэнта РБ былі слаба падрыхтаваны. Галасаваньне не была нават масавым - рэпрэсій не было, бо Лукашенко сядзеў пад сталом і плакаў. Я лічу, што ганебным фактам сталася тое, што Зянон «зняў» сваю кандыдатуру. Ён ужо быў у ЗША – баяцца яму не была прычыны. Навошта згаджаўся? Што ён не ведаў «што ёсьць» Ганчар?

У 1999 годзе прайшлі выбары ў БНФ і мясцовыя выбары. Выключная ўпартасьць Пазьняка - быць «Ленінымі» і **кіраваць БНФ «факсамі»**, раскалола БНФ і вельмі аслабіла апазіцыю.

Абсалютны памылкай «апазіцыі» быў байкот мясцовых выбараў, хаця быў шанец для перамогі. Я перакананы, што ў 1999-м, годзе разгубленнасьці дыктатара Лукашенко і маўклівага «НЕ» для дыктатара з боку міліцыі ... БЫЛА 90%-я МАГЧЫМАСЬЦЬ УЗЯЦЬ УЛАДУ Ў МЯСЦОВЫХ САВЕТАХ АПАЗЫЦЫЙНЫМІ ДЭПУТАТАМІ. Але лідэры апазіцыі так «зацыкліліся» на асабістых праблемах, што забыліся для чаго яны ёсьць! «Дэмакраты» моўчкі пагадзіліся з заявай «лідэраў» аб байкоце мясцовых выбараў.

**2000 год**. Апазіцыя у знак пратэста абвясьціла байкот («канапавы») нібы “выбарам” у нібы «парламент». Я падтрымаў ідэю БАЙКОТУ, але не форму. Цікавы факт: мне мясцовая ўлада (Менск, Першамайскі р-н) прапанавала падтрымку, калі я буду кандыдатам у «дэпутаты». Я перакананы, што ў мяне была рэальная магчымасьць быць стаць «дэпутатам».

**2001 год.** Лукашэнкаўскія (па «ягонай” Канстытуцыі) выбары Прэзідэнта РБ. Лідэры апазыцыйных партый так моцна баяліся «знікнуць», што ў 1999 і 2000гг. нават НЕ думалі аб выбарах «Прэзідэнта»! Абсалютная віна кіраўнікоў палітычных партый, што яны не падрыхтаваліся да 2001году. У выніку, аддалі «кандыдата» сакратару КПБ, які не меў аніякай магчымасці (бязь сваіх структураў) арганізаваць эфектыўную агітацыю. Але важна і тое, што апазіцыйныя грамадзяне, перад усім сябры партый, <u>не хацелі агітаваць</u> за члена КПСС, старога функцыянера СССР-га прафсаюза! Вядома, што лідэры апазіцыйных партый адышлі ў бок. Так, была прапанова Мілінкевіча-Вячоркі падтрымаць Домаша (таксама члена КПСС), але яна прыйшла вельмі позна.

90% сяброў Апазіцыі не хацелі і не працавалі на выбар «альтэрнатывы» старому камуністу. Вось факт. У траўні 2001 года, я разам з А.Астроўскім, медыкам-выкладчыкам у Гародні, аб'ехаў ўсе абласныя гарады з мэтай актывізацыі сяброў Апазіцыі для паспяховай выбарчай кампаніі... Толькі ў Віцебску і Гомлі сабраўся мясцовы актыў, каб паслухаць нашы лекцыі-парады.

Але ў цэлым, нацыянальнай актыўнай агітацыйнай кампаніі за «нашага кандыдата» не было. Дарадцы «кандыдата Ганчарыка» памылкова параілі яму аддаць кіраваньне кампаніяй тэарэтыку-палітолагу Наумавай, якая абсалютна не разумела псіхалогію беларусаў. (Магчыма была моцная надзея на падтрымку «Масквы».) У штабе Ганчарыка «працаваў» "связной" - расеяц (на маю думку супрацоўнік "ГРУ" Расеі - Андрей Суздальцов, выпускнік «Высшей школы профсозов» – агентуры «КГБ". Я мяркую, што калі б не страх «лідэраў» Апазіцыі і ўсе актыўна працавалі, то выбралі бы «Кандыдата» ў студзені 2001 года і быў бы новы Прэзыдэнт! Так народ Беларусі згубіў у першы раз магчымасьць скінуць дыктатара ў 2001 годзе!

**2004 год**. Чарговы незаконны «референдум» дыктатара. Дыктатар-калгасьнік вырашыў «законна аформіць» свае пажыццёвае кіраваньне калгасам «Беларусь». Рэферэндум супярэчыў Канстытуцыі, законам РБ, і высновам «Венецыянскай камісіі» (WWWcoe.int). Абсалютна НЕЗАКОННА і не дэмакратычна было выносіць на нацыянальны Референдум прыватнае пытаньне. Ці «падняла» Апазіцыя «народ»? Не!. Бо «народ» глядзеў «целевізар», то бок, прапаганду, што жывецца «всё лучше и лучше», так бы мовіць зразумела пад чыім кіраўніцтвам. Больш таго, адразу пасля выбараў «прэзідэнта» (2001) пачаліся «кропкавыя» рэпрэсіі супраць Апазіцыі (пад гэтыя «кропкі» патрапіў і я). Дыктатар, пры падтрымцы русского Бандыта (Пуціна) пачуваўся ўпэўнена. Так, «Крэмль» яму ўжо «не светит», але ўладу у «РБ» мае "больше чем у Царя».

З другога боку, трэба адзначыць аб'ектыўную сітуацыю: Internet у РБ быў яшчэ вельмі слабы, мабільныя тэлефоны – толькі ў багатых... Апазіцыйных газетаў – адна, дзве... Найбольш масавая «НВ» увесь час была максімальна «мяккая» у сваёй апазіцыйнасьці. Рэдактар Сярэдзіч не хацеў нават зрабіць сталую «паласу» аб сталінскіх рэпрэсіях (якія ПАЎТАРЫЛІСЯ ў 2020, 2021, 2022-м і?)... Але Сярэдзіч падтрымаў маю ініцыятыву: АБАРАНЯЦЬ БЕЛАРУСКУЮ МОВУ! Для мяне дзіўна, што Абарону беларускай мовы НЕ падтрымалі беларускія дэмакраты, нават сябры БНФ, нават філолаг, кіраўнік БНФ Валянцін\Вінцук Вячорка. Яны ўсё яшчэ спадзяваліся на «палітыку».

Беларуская Апазіцыя не змагла (сябры партый), ці не захацелі скарыстацца досьведам падпольнай дзейнасьці польскай Салідарнасьці, калі нелегальныя газэты, улёткі, тысячамі, кожны тыдзень, былі ў амаль кожным горадзе. У выніку Апазіцыя

№.29, красавік 2022 ISSN 2562-950

НЕ змагла растлумачыць электарату шкоднасьць дыктатарскага «референдума». Аляксандр Лукашэнка зрабіў сабе «легальную» магчымасьць «выбірацца» неабмежаваную колькасьць разоў. «Выбарчыя камісіі» атрымалі загад падпісываць «Протокол выборов» толькі той, які дасьць мясцовая адміністрацыя. «Назіральнікаў» пачалі адкрыта ігнараваць. Фальсіфікацыя выбараў была.

Нейкай рэальнай актыўнасьці, аж да канцы **2005** году не было.

**2006 год.** «Дэмакратычныя выбары адзінага «Кандыдата»! Лідары Апазіцыі прапанавалі «супердэмакратыю» - «танцуют все»! (Я сам стварыў праз актыўны ўдзел ці быў ініцыятарам 10 NGOs, то бок, няўрадавых арганізацый і трох апазыцыйных партый таксама). Я ведаю дзейнасьць NGOs, я вельмі крытычна ставіўся да сяброў NGOs, як актораў палітычнай дзейнасці ( у большасьці). Але калі ўсе – то ўсе. Некаторыя сябры апазыцыйных партый - сябры «хлебных»/гранты\ NGOs прапанавалі роўныя правы для NGOs-каў у выбарах Кандыдата на пасаду Прэзыдэнта РБ. Найбольш актыўным быў тут Віктар Карніенка – які прапанаваў і «пратасківаў» кандыдатуру Мілінкевіча. Я не быў супраць Мілінкевіча, але ён ад NGOs! (дарэчы Мілінкевіч, разам з Карніенка, не змог нават актывізаваць **сваіх NGO**s-каў пад час выбараў **іх** Кандыдыта на Прэзыдэнта РБ)! Дарэчы, менавіта я паспрыяў сустрэчы Кандыдата Мілінкевіча з Прэзыдэнтам Францыі і ініцыяваў сустрэчу Кандыдата Мілінкевіча з нямецкім Канцлярам, якая адбылася. Віктар Карніенка, як неблагі арганізатар, змог зрабіць так, што на выбарчым З'ездзе дэлегатаў ад NGOs была больш, чым дэлегатаў ад палітычных партый. NGOs "прагаласавалі» за Мілінкевіча і пахаваліся «у бульбу». С.Калякін, кіраўнік выбарчага Штаба Мілінкевіча, заявіў пасля выбараў 2006, што ЗАРЭГІСТРАВАЛІСЯ і абяцалі працаваць на Кандыдата) 5000 чалавек (на ўсю Беларусь)!!! *Рэальна працавалі ТОЛЬКІ каля 1000 чалавек!»*

Вынік выбараў 2006-га мы ведаем! Народ Беларусі згубіў у другі раз магчымасьць скінуць дыктатара. Бо «народ» тады (праз значнае зніжэньне даходаў) быў вельмі злы на дыктатара Лукашенко і пагадзіўся бы скончыць з "сацыяльным контрактом" (акрэсленьне палітолагаў) дыктатара. У 2006 годзе сярэдні заробак у Беларусі набліжаўся да 300 даляраў. Такім чынам, Гэта 2-гі раз, калі абсалютная віна за паразу была на Апазіцыі, то бок, усіх грамадзянаў РБ дэмакратычных поглядаў.

Быў, канешне, і расейскі «Кандыдат» - Казулін, былы рэктар Беларускага «государственного» універсытэта, былы міністр, які купіў Партыю сацыял-дэмакратаў, на гвалт быў «выбраны Старшынёй» і, адпаведна, стаўся «Кандыдатам на Прэзыдэнта РБ» ад Партыі. Які, дарэчы, зладзіў вялізную правакацыю «Поход на Окрестино – тюрьму». Шмат людзей ад «Похода» пацярпелі, былі збітыя «ОМОН-м».

... Потым зноў БЫЛА “спячка” Апазіцыі, пры тым, што NGOs цікавілі толькі атрыманьне грантаў і фармальнай справаздачы за атрыманыя грошы. А «народ»? Жыхары РБ яшчэ жывуць згодна з шаблонамі: «*Абы не было вайны», «Может быть и хуже*» (калі рыпацца). Што можа сведчыць аб тым, што абсалютная большасць «белорусов» мае вельмі моцны ГЕН РАБА. Прыклад. 1991, 20 жніўня... Я хадзіў па галоўным праспекце Менска з плякатам: «МЫ - БЫДЛА?» Ніхто мяне не абразіў і не пабіў. Другі прыклад. Толькі ў 2020 годзе з’явілася песьня: «*МЫ - не быдла*».

Вынік? Вядомы. Ёсьць такая прымаўка:»*Можна каня зацягнуць да вады, але калі ён ня хоча піць – піць ён НЕ будзе».* Я, неяк пры размове з Анатолем Лябедзька так акрэсліў «народ» РБ – НЕмагчыма выцягнуць бегемота з балота – калі ён ня хоча вылязьці з таго балота.

Але для справядлівасьці трэба падкрэсліць, што дэмакратычны Захад даваў вельмі мала грошаў для беларускай Апазіцыі. Немцы, якія знішчылі 30% БЕЛАРУСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА (WWII) не далі фінансавай падтрымкі беларускай Апазіцыі. Ангеліна Меркель 16 гадоў гаварыла сваім урадам , што “*Белоруссия – гэта зона Russland-России”!*!! Бадай яна ведала аб татальнай руссификации беларусаў праз структуры русшавинистычнай КПСС і ведала дэмаграфічную сітуацыю ў Беларусі. Для яе неістотна была існаваньне сувэрэннай незалежнай Беларусі – галоўнае money from Russland праз нямецкі бізнес. Астатнія «заходнікі» давалі дапамогу дзяржаўным структурам і дэмакратам на «навучаньне», ды «англамоўным» NGOs-м на падтрымку “існаваньня”. **Прыклад са ЗША. Урады ЗША далі кыргызскай Апазіцыі адзін мільярд даляраў (насельніцтва там у два разы меньш),** адпаведна, кыргызы зрабілі паспяховую Рэвалюцыю. Можна таксама ўзгадаць сербскую «Одпор» і арганізацыі Ўкраіны, **якім Захад даў вялізныя грошы** «на рэвалюцыю». Беларуская Апазіцыя ва ўсе часы атрымала ад агульнага Захаду толькі некалькі дзесяткаў мільёнаў даляраў – эўра! (ня больш за 50) для «дэмакратаў» у Беларусі. Бяз грошай ці з мінімальнай іх колькасьцю можна была рабіць палітычныя кампаніі толькі да 1994 года.

Дарэчы, паглядзіце на «санкцыі» для дыктатуры ў 2020 годзе! Ёсьць нават краіны ў Еўропе, якія просяць EU адмяніць некаторыя «санкцыі»... Што ім Беларусь! Ім трэба MONEY! Гэта «ключавое слова» для заходніх краіны, што вымушае стварыць наш моцны «лоббінг». Але Беларусы ня могуць арганізаваць такі лоббінг, фактычна паўтараецца Гісторыя 1918 года і «гандаль» пераможцаў у WWI, у Парыжу без Беларусаў! Так, штаб Сьвятланы Ціханоўскай спрабуе, і сама яна, абраная Прэзыдэнтам Беларусі, робіць вялізныя высілкі... Але... Але...

**Далей...** Так, даходы - зарплаты жыхароў РБ сапраўды раслі... Адпаведна: «*политики нам не надо».* А што Апазіцыя? Яна існавала... Праляцелі 2007, 2008, 2009 гады.

Апазіцыя пачала зноў думаць аб выбарах «Прэзідэнта» і шукаць адказ на «народную адгаворку»: «***Калі не Ён .... то ХТО?»***

**2010 год.** 19 сьнежня 2010 года памятаюць усе. Выбары «Прэзідэнта РБ» адбываліся пад кіраўніцтвам Галоўнага Фальсіфікатара - злачынцы – Лидии Ермошиной (незаконна прызначанай на пасаду) з адпаведнымі камісіямі фальсіфікацый, здзяйсняючы дзяржаўнае злачынства. Але Апазіцыя ўсё ж такі вырашыла ДАЦЬ адказ на народнае пытаньне: «-то ХТО?» і выставіла 8 сваіх кандыдатаў, людзей розных прафесій, match узросту, розных поглядаў. Быў, канешне, і расейскі «Кандыдат», эканаміст, які «самастойна вылучыўся на «Кандыдата» (Терещенко Виктор Иванович). Здавалася, што для электарату сапраўды прапанавалі ВЫБАР - выбірай «Прэзідэнта» на свой густ, але і ПАДТРЫМАЙ СВОЙ ВЫБАР! Выбіралі. Але з «выбарчых камісій» Апазіцыя атрымала інфармацыю: *робіцца татальная ФАЛЬСІФІКАЦЫЯ !*

Напярэдадні «выбараў» прадстаўнікі Апаіцыі вялі перамовы з «чынавенствам» - было «Обещание солидных людей» аб падтрымцы змяніць уладу, то бок дыктатара Лукашэнкі (у 2020 годзе А.Саннікаў аб гэтым заявіў публічна). Але 19.12.2010 Апазіцыя была падманутая тымі «солидными»! У выніку, не надта шматлікі пратэст, каля 30 000 (не лічым, каля 10-15 000 “назіральнікаў», якія выглядалі з «подворотни»), бандыты дыктатара Лукашэнкі жорстка «*«разагналі*». Зразумела, што была і падрыхтаваная Правакацыя: «Неизвестные люди» разбілі шкло дзвярэй Дома «СовМина». Чамусьці ўся «праваахоўная» сістэма Дыктатара не змагла знайсьці “хуліганаў” -правакатараў. Зразумела чаму: «*своих не сдаём*». Нават аднаго «пакаранага» з таго кодла вельмі хутка вызвалілі ад пакараньня.

**Выснова 2010-га**. Чаму не «скінулі»? Таму, што лідэры Апазіцыі ды і гультаяватыя «сябры» хацелі «простага варыянта» - дамовімся з «чынавенствам», а абыякавы «народ» пагадзіцца на кожную змену. Забыліся «лідэры Апазіцыі» народную прымаўку: *«Лепш сініца у руках, чым журавель у небе*». А дыктатар, паталягічны хлус, Лукашэнка, напярэдадні «галасаваньня» паабяцаў усім «по 500» - то бок зарплату-мару беларусаў у 500 даляраў. А рэальна «народец» атрымаў толькі блізкія да таго 370 даляраў у *чэрвені 2016 году* (для даведкі: у 2006 годзе сярэдні заробак у Беларусі быў каля 300 даляраў).

Вось гэты самападман «народа»-электарату і быў асноўнай прычынай, таго, што абсалютная большасьць выбарцаў НЕ пратэставала супраць фальсіфікацый і НЕ падтрымала Апазіцыю. Жыхары РБ нават не байкатавалі выбары «прэзыдэнта» у 2015 годзе, то бок, былі згодныя падманвацца далей. НЕ пакрыўдзіліся на «*прэзідента*»... А «по 500» і сёньня няма!

У выніку дыктатар-бандыт Аляксандр Лукашэнка загадаў *«Жесточайше наказать бунтовщиков»*.

**2011 год**. Гэта быў годам шока, годам зьнішчэньня Беларускай Апазіцыі, у тым сэнсе, што дзейнасьць Апазіцыі была цалкам спынена. Практычна ўсе лідэры Апазіцыі і актывісты былі кінуты за краты! Менавіта тады вельмі шмат), актывістаў Апазіцыі была (праз запалохваньне завярбавана ў якасці «сексотаў» КГБ. У дадатак, каб прыкрыць тэрор супраць грамадзянаў Беларусі, дыктатар Лукашенко (по совету с Москвы) зладзіў тэрарыстычны акт у менскім метро (я перакананы, маю аналіз, што менавіта спецслужбы дыктатара падрыхтавалі гэты тэрарыстычны акт (раней «трэніраваліся ў 2008 годзе).

**2014 год.** Год вялікага страху. Пуцінская, расейская вайна супраць Украіны і акупацыя Расеяй часткі тэрыторыі суверэннай Украіны. У Беларусі ўсе спалохаліся, нават, дыктатар Лукашенко - «*Мы на чарзе!*?» У сітуацыі адкрытай агрэсіі Расеі на сувэренную дзяржаву Беларуская Апазіцыя вырашыла не даваць аніякай «прычыны» расейскім агрэсарам да вайсковай акупацыі Беларусі. Бо, вядома, што «падставай» расейскай вайны супраць Украіны, быў «Майдан».

**2015 год.** «Выбары прэзыдэнта». Апазіцыя не ўдзельнічала ў чарговым прапагандыскім спектаклі дыктатуры. Але, створаная праз КГБ «организация - Говори правду» для «красивой победы» правителя Беларусі, прапанавала «свайго Кандыдата». ЦВК нават не лічыла «собраныя подписи за Кандидата». Гэта была самая ціхая, самая млявая «выбарчая кампанія» за ўвесь час. Усе жыхары РБ разумелі: абы ціха.....

Далей, жыццё паказала, што і ў «балоце» не ўсё «ціха». Вырасла маладое пакаленьне, якое карыстаецца Інтэрнет тэхналогіямі, амаль не глядзіць дзяржаўнае «ТВ», не чытае газеты... Адпаведна яно меней атручана прапагандай дыктатуры і не бачыць «*счастливую жизнь белорусов*» в телевизоре. Для маладых (25-40 гадоў) робіцца амаль правілам кожны год адпачываць у розных краінах Сьвету і на «закупы» ехаць у Вільню, ці ў Польшчу. Каля 300 000 візаў, амаль кожны год, атрымлівалі грамадзяне РБ ( на маю думку, кожны год, такія візы атрымлівалі тыя самыя людзі). У выніку, актыўная частка грамадзтва ПАБЫЧЫЛА, што МОЖНА ЖЫЦЬ ЛЕПШ. Вось і пачалося ціхае саспяваньне БУНТУ...

**2020 год. БУНТ АДБЫЎСЯ.** Так, менавіта гэта быў бунт маладых грамадзянаў РБ, так бы мовіць «сярэдняй клясы», людзей, якія будуюць САМІ СВАЁ жыццё, бязь патэрналістычнай ласкі дзяржавы, якія хочуць жыць як грамадзяне дэмакратычных дзяржаў, якія стаміліся ад штодзённай хлусні дыктатара і “вечнага прэзідэнта”. Людзі выйшлі на мірны пратэст на вуліцы гарадоў Беларусі.

Бунт у значнай меры, быў падрыхтаваны інфармацыяй у Інтэрнэт і «новымі актёрами» выбарчай кампаніі. Так, «новымі актёрамі», таму што Апазіцыя (называюць яе «старой») не змагла падрыхтаваца да “выбараў”. Усе структуры Апазіцыі былі вельмі моцна прасякнуты агентамі "КГБ", нават кіраўніцтва БНФ (пасля 2010-га) пісала «справаздачы» ў «КГБ». Зразумела, што ў такіх умовах падрыхтаваць Рэвалюцыю не было аніякай магчымасьці. Бо нават, «сходы» у Вільні, без «прослушек», былі марнымі, калі на гэтых сходах прысутнічалі «сексоты» ( у сваім фэйсбуку, на пачатку выбараў, я так і напісаў - *перамога Дэмакратаў немагчыма).*

Далей, трыумф “хатняй гаспадыні” Сьвятланы Ціханоўскай, выключна жорсткія, бандыцкія рэпрэсіі МАФІІ тэрарыста Аляксандра Лукашэнко, эміграцыя новых лідэраў, стварэньне Цэнтраў беларускіх дэмакратаў у Польшчы і Вільні ...

Далей, «ГУЛАГ» - «Государство управляемое Лукашенко Александром Григорьевичем» у чыстым выглядзе, дзе «*НЕ ДО ЗАКОНОВ*» (нават своих лукашенковских), непрызнаньне Лукашэнкі легітымным прэзідэнтам РБ, а пасля прымусовай пасадкі НЕ свайго самолёта, Лукашэнка Аляксандр стаў яшчэ і тэрарыстам!!! Па факту РЭПРЭСІЙ ў 2021 г., відавочна, што агент Москвы - Александр Лукашенко знішчае перадусім УСЁ беларускае!

А што Апазіцыя? «Старая» Апазіцыя дае месца «Апазіцыі маладой». Вынікам 2020-2021 гадоў для дэмакратаў сталі сталінскіе рэпрэсіі.

**IV. Неўрадавыя арганізацыі**

Насельніцтва РБ каля 9,5 мільёнаў. Колькі была зарэгістравана неўрадавых арганізацый (НУА, NGOs -далей) афіцыйна да 2020 года? Каля 3000. У Польшчы з насельніцтвам у 38 млн. – каля 100 000 NGOs ,у Кыргызстане на 5 млн. - каля 50 000 NGOs.

Дыктатар Лукашенко пачаў душыць NGOs ужо пачынаючы з 1999 году. На маю думку КАРЫСНАГА ЭФЭКТУ ад зарэгістраваных неўрадавых арганізацый (NGOs) для Беларусі беларускай і дэмакратычнай няма! Прыклад. Я сябра ТБМ і стваральнік-сябра Фонду імя Льва Сапегі. Ці дамаглося ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ (за 30 ГОД) СТВАРЭНЬНЯ БЕЛАРУСКАГА УНІВЕРСІТЭТУ? НЕ і НЕ!!! ЦІ БЫЛА ІНІЦЫЯТЫВА і ДАПАМОГА ТБМ па стварэнью БЕЛАРУСКАЙ нядзельнай школы ў кожнай адміністратыўнай адзінцы, ці нават «мікрараёне»? НЕ і НЕ !

Фонд імя Льва Сапегі, раней, «Беларускі Фонд Дэмакратычных Рэформаў» працаваў для мясцовай улады. Фонд ад 1992 года (30 год маем!) «вазіў мясцовых чыноўнікаў і дэпутатаў «палаткі» ў Еўропу! Каб яны навучыліся дэмакратыі, надрукаваў вялікую колькасьць кніжак (на рус.яз.) пра «*опыт демократических реформ*». Вынік: як была мясцовая «вертикаль» пазбаўленая нават кантролю з боку жыхароў ... так і засталася. Для вырашэньня праблем жыхары вымушаны ладзіць вулічныя мітынгі бо звяртацца да «депутатов» няма сэнсу.

Але з другога боку, НЕ NGOs, а «ініцыятывы» сапраўдных Беларусаў тыпу «МОВА-на-НОВА», ці бізнес структуры Беларусаў, як Крама Паўла Белавуса зрабілі шмат карыснага для БЕЛАРУСІ, для Нацыі Беларусаў. З другога боку, ёсць яшчэ адзін добры «эфэкт» некаторых неўрадавых NGOs – яны назапасілі карысную інфармацыю для будучай Беларусі і давалі грошы на «хлеб» дэмакратычным людзям.

**V. Чынавенства**

Тут усё вельмі проста: у Беларусі (з 87% этнічных «белорусов») **нацыянальнага беларускага чынавенства няма.** Калі няма «нацыянальнага», то «ценностью» для чиновников застаюцца толькі «ДЕНьГИ». Вось таму і падманулі чиновники Апазіцыю у 2010-м, вось таму і «НЕ ПЕРЕШЛИ на СТОРОНУ НАРОДА» у 2020-м. Усе яны маюць АДГАВОРКУ: «*У меня семья, дети*», і «*А кто мне даст деньги?»*

Гэта у Польшчы мог адбыцца і адбыўся «Круглы стол», бо там чынавенства – гэта таксама ПАЛЯКІ, для якіх POLSKA павінна быць POLSKA! **А дзе мы маем нацыянальных чыноўнікаў ? Дзе яны? Дзе беларусы?**

**VI. Этнічныя беларусы на Захадзе**

Тут таксама ўсё вельмі проста. Да 2020-га БЕЛАРУСАЎ па-за межамі Беларусі (акрамя Канады і крыху ў ЗША) не было, то бок, яны не паказваліся, не звярталі ўвагу мясцовых уладаў на факт, што яны НЕ «***русский***» , НЕ «***русская***». Ад пачатку эміграцыі XX-га стагоддзя этнічныя беларусы далучаліся да суполак палякаў ці русских. Але пратэсты 2020 года ў самой Беларусі абудзілі беларускія душы на ўсёй планеце. Памятаеце фота? Але зараз важна каб абудзіўшыся, Беларусы ізноў не заснулі.

Іх задача кожны дзень нагадваць пра Беларусь, ствараць моцныя «лоббінговыя групоўкі» для падтрымкі Беларускай Апазіцыі. Задачы мінімум:

 ISSN 2562-950

1) НЕ дадаваць да прозвішча «Лукашэнка» слова “President” (на ўсіх мовах) афіцыйнымі структурамі і асобамі;

2) не карыстацца перакладам з рускай мовы назвы нашай краіны, а толькі – BELARUS;

3) дамагчыся слуханьняў у нацыянальным(х) Парламенце «Аб парушэньні Правоў Чалавека дыктатурай у BELARUS” праз працу з дэпутатамі і СМІ.

**VII. Журналісты**

Перадусім трэба падкрэсліць, што ёсьць вялікая розніца паміж дзяржаўнымі журналістамі і недзяржаўнымі. **Дзяржаўныя работнікі, якія лічаць сябе «журналистами» ёсьць прапагандыстамі дыктатуры** і толькі.

Але недзяржаўныя журналісты вельмі часта ў «пагоні за сенсацыяй» забываюцца аб галоўных праблемах, аб лёсах людзей, аб злачынствах дыктатуры. Праца толькі на «рэйтынг» - гэта несумленная праца журналіста, калі краіна крэхчыць пад ботам дыктатара. Такая «праца» журналістаў Радыё Свабода (РС, svaboda.org), была амаль правілам. На Эўрарадыё такіх «выпадкаў» была значна меней, «маладыя» асабліва так вылузваліся. НЕ стварэньне «сенсацыі» - праца дэмакратычных СМІ.

Асаблівасьць журналістаў РБ, гэта рэклама «лідэраў» - «людзей вядомых», толькі. Тут зноў журналісты РС «наперадзе». Так журналісты забываюцца «для чаго яны ёсьць». ***Як чалавек будзе вядомым, калі яго СМІ не бачаць?*** Роля РС – гэта асобная тэма. Да 2020 г. спецыяльнасьцю РС была татальная крытыка Апазіцыі. Кіраўнік (А.Лукашук) і ягоныя дарадцы ў Празе забыліся: «ЯКІ НАРОД - ТАКАЯ І АПАЗІЦЫЯ». У выніку, РС, забыўшыся на сваю «місію» дапамагала дыктатуры. Больш таго, нават у адрозненьні, ад расейскай РС са значным элементам «русского национализма» (часамі меней), «Беларуская рэдакцыя RFRL – “Радыё Свабода», баіцца нацыянальнага БЕЛАРУСКАГА АКЦЭНТУ, вельмі часта нават словамі «гасцей» зневажае і абражае Беларусаў. Прыклады: Портнікаў абразіў журналіста РС Д.Гурневіча; расеец, сацыёлаг Коршунов, фактычна сказаў, што Беларусы – яшчэ не-Нацыя («*шукаюць*») і г.д. Місія РС – НЕ быць проста добрым еўрапейскім (ЗША-м) СМІ, а дапамагаць беларусам разумець Дэмакратыю, Правы Чалавека, дапамагаць Апазіцыі ў змаганьні з дыктатурай.

Вельмі, часта запрошаныя на РС «эксперты», замаскаваныя лукашысты, з дапамогай НЛП і іх «куратара» космополита Юрыя Дракохруста (спадзяюся не «сексота»), праз РС працуюць на дыктатуру. І толькі калі самі «эксперты» публічна «адкрываюцца», тады і Дракохруст (РС) іх не запрашае на РС. Ці нават ворагі Беларусі «на РС»,

маскалі, якіх вельмі любіў (? любіць і зараз) Дракохруст, такія як маскоўскі Суздальцев і маскоўскі Коктыш...

Хацелася б, каб праца журналістаў была: 1) нацыянальнай, 2) спрыяльнай для Дэмакратыі і Правоў Чалавека 3) дакладнай (факт, месца, назва, справа, прозвішча), 4) адкрываючай новых людзей, а не «ездзіць» на «старых вядомых».

**VIII. Расея**

Краіна з імперскім духам і генамі (у «русских») агрэсіі татара-манголаў - гэта пракляты наш сусед - Россия! Моцна? А гэта што? «Московских войн было несметное количество. Назовем даты лишь некоторых из них: 1487−1494, 1500−1503, 1507−1508, 1512−1522, 1534−1537, 1561−1570», і далей... пасля паўстаньняў, перадусім, рэпрэсіі былі супраць адукаваных беларусаў. Цікавы факт (ёсьць на маім «фэйсбуку») пасля падзелу Рэчы Паспалітай на тэрыторыі беларусаў аж да Смаленска былі (заставаліся) польскія школы, але НЕ было нават адной беларускай школы. Стратэгічнай задачай кожнай маскальскай улады (і зараз) была (і ёсьць) знішчыць «*миф нации белорусов*» і «*влить их в славянское море*» - словы паэта А.Пушкина, то бок, у «русское море». Ад падзелу Рэчы Паспалітай маскальская ўлада працягвае РУССИФИКАЦИЮ БЕЛАРУСАЎ! Зараз з дапамогай свайго капрызнага агента Лукашенко (ад 1995г.). Дастаткова паслухаць (чытаць) черносотенца-империалиста Путина каб зразумець, што Масква хоча знішчыць Беларусь, адпаведна і Беларусаў. Прыкра,але пакуль Расея, як дзяржава, не разваліцца, яе «меч» заўсёды будзе вісець над нашымі галовамі...

**IX. Захад**

Пад «Захадам» мы разумеем дэмакратычныя дзяржавы заходняй Эўропы (меней – паўночнай), ЗША і Канаду. Захад мае 2 (два) твары. 1 -н – для публічнасьці. 2-гі – сапраўдны, прыхаваны. Першы – гэта дэкларацыі - гаворка пра Правы Чалавека і Дэмакратыю з мінімальнай падтрымкай гэтых каштоўнасьцей... Другі твар – гэта твар суперліберальнага капіталізму, то бок, найвышэйшая каштоўнасьць – гэта MONEY!!! (яскравы прыклад - Нямеччына). Грошы і яшчэ раз Грошы. Прыклад. Чаму капіталістычная нарвежская Yara не спыніць закупкі калійнай солі ў дыктатуры? Ды іншыя... Напрыклад, пабудова расейскіх газаправодаў наўпрост да Германіі – вядома ж, што газ і нафта гэта таксама зброя імперыяліста Путіна.

Усе заходнія ўрады, то бок, людзі-палітыкі ў гэтых урадах абапіраюцца на вялікія бізнес-канцэрны, якія *de-facto* кіруюць гэтымі палітыкамі. Прыклад: Германія. Вельмі вядома аб махлярстве аўтамабільных канцэрнаў, з фальсіфікацыяй колькасьці выкідаў «CO2». Што іх пакаралі? Не, бо яны фінансуюць палітыкаў.

Іншы ФАКТ. Канцлер Ангеліка Меркель (у Берліне) сустрэлася з Дэлегацыяй Беларускай Апазіцыі... На пытаньне Старшыні БНФ, Р.Кастусёва: «*Калі будзе План «маршала» для Беларусі?*» Немка адказала: “*Спачатку для Грэцыі*» (на той час была катастрофа ў Грэцыі, да якой прычыніліся таксама і нямецкія банкі - дык вось то план Меркель для ратаваньня нямецкіх банкаў). З другога боку... як даведаліся пасля яе сыходу з «канцлера» - яна заўсёды гаварыла сваім палітыкам, міністрам, што Беларусь – гэта зона России! Але і іншыя эўрапейскія палітыкі, мелі думку аб нашай Беларусі, блізкую да нямецкай «пазыцыі».

Але і зараз, у 2022-м годзе «Нямецкага плана для Беларусі будучай дэмакратычнай, ці для дапамогі Апазіцыі, нават на паперы, няма.

*Выснова:* проста спадзявацца нам, Беларусам, на істотную дапамогу Захаду няма сэнсу. Але “захад” можна «прымусіць» дзейнічаць рэальна праз актывізацыю грамадзкай думкі ў іхніх краінах і паказаць іх капіталістычны «інтарэс» - карысць ад існаваньня дэмакратычнай незалежнай Беларусі.

**X. “Лоббінг”**

Што ёсьць «лоббінг»? Гэта слова-вызначэньне паказвае нам, што існуе пэўны працэс для прасоўваньня, рэалізацыі інтэрэсаў пэўных груповак праз легальную дзейнасьць «лаббістаў» у цэнтрах прыняцца рашэньняў. Напрыклад, у ЗША, пры парламенце, нават ёсьць афіцыйная рэгістрацыя лаббістаў.

Што для Беларусаў? Задача нашых лабістаў гэта: ЗНАЙСЬЦІ, дамовіцца (як мінімум) з адным дэпутатам мясцовага Парламенту, каб ён, час ад часу, афіцыйна, у парламенце, у СМІ «падымаў» беларускую «праблему». Але беларускія лабісты могуць і павінны быць пры самых розных замежных арганізацыях: ад СМІ да NGOs. Задача мінімум: 1) дамагчыся каб Беларусь называлі толькі як *BELARUS;* 2) дамагчыся, каб тэрарыста Лукашэнка НЕ называлі “President”; 3) дамагчыся слуханьняў у мясцовым Парламенце «*Правы Чалавека ў Беларусі».*

**НЕ ДАЦЬ ЗАБЫЦЬ БЕЛАРУСЬ ! Перад усім «трэсьці» мірна Захад!**

2020 год паказаў, што беларусы ёсьць амаль у кожнай краіне нашай планеты. Беларусы рабілі пікеты, давалі «інтэрв‘ю» для СМІ... То, нельга спыняцца, трэба шукаць сяброў і падтрымліваць з імі кантакт.

**У заключэньне:**

1. Вельмі коратка ЧАГО ДАМАГЛАСЯ АПАЗІЦЫЯ («старая» і новая)? «Старая» паказала, што нацыянальныя беларускія каштоўнасці ёсьць грунтам Дэмакратыі і Незалежнасьці Беларусі. Вось таму, Нацыянальны Бела-Чырвона-Белы сьцяг лунаў над сотнямі тысяч людзей у 2020-м. Таксама была і «Пагоня». Вось таму расейскі агент-знішчальнік Беларусаў і Беларусі (як дзяржавы) А.Г.Лукашэнка жорстка карае за дэманстрацыю Бела-Чырвона-Белага сьцяга і, нават, за коляры нашага Сьцяга. Таксама і за «дазволеную» нашу «Пагоню».
2. У 2020-м дыктатура Лукашэнкі пакарала каля 40.000 людзей, каля 10 чалавек забіла, сотні людзей пакалечыла, тысячы людзей жорстка катавала. Вынікам 2021-га (па інфармацыі праваабаронцаў) – 1285 асуджаных на 2000 гадоў зьняволеньня (на люты 2022 – 1600 зьняволеных), каля 100.000 беларусаў вымушаны былі выехаць з краіны. Але рэпрэсіі дыктатура не спыняе.
3. Новая Апазіцыя нарадзілася з бунту разумных людзей, якім абрыдла быць рабамі калгаснага дыктатара. Яны прачнуліся з «Фабрыкі сноў» і вырашылі дзейнічаць. Вынікі, пакуль, сумныя, але гэта пачатак пераможнага Змаганьня. Новая Апазіцыя стварыла некалькі цэнтраў супрацiву (у Варшаве і Вільні). Пасьпяхова дзейнічаюць «Кіберпартізаны». Вельмі пасьпяхова (у межах магчымага) дзейнічае Сьвятлана Ціханоўская, выбраны народам Беларусі, Прэзыдэнт Рэспублікі Беларусь.
4. Адказаць на пытаньне "ЦІ ЗГУБІЛІ МЫ БЕЛАРУСЬ?" - сёньня мы ня можам па адной галоўнай прычыне – ёсць бандыт Путин і имперская Расея, расейскія войскі ў Беларусі... Расейскі імперскі шавінізм наступае на НАШУ БЕЛАРУСЬ.
5. Гісторыя Беларусаў вельмі сумная - увесь час знішчэньне, перадусім, Беларусаў-інтэлектуалаў, «ген Раба» мае моцную «пазыцыю» ў арганізмах большасьці этнічных беларусаў.
6. ІТ-тэхнялогіі, Інтэрнэт пазбавілі дыктатуру прылады эфектыўнай прапаганды - «целевізара». Больш таго, незалежная бізнес-актыўнасьць і выезды (турысты) вялікай колькасьці жыхароў Беларусі на Захад, дазволілі маладым людзям зразумець, што жыць пад ДЫКТАТУРАЙ НЕЛЬГА!
7. 27 год цараваньне калгасьніка-дыктатара мела на мэце зрабіць з «белорусов» цалкам «ру*сскими са знаком качества*», то бок, абсалютнымі рабамі. З тым, каб пасля сыходу (натуральнага, ці прымусовага) капрызнага агента Масквы - А.Лукашэнкі, бязь «бою» зліквідаваць дзяржаву Беларусь і «влить» гэтую тэрыторыю ў склад Расеі. (дыктатар гаварыў: «*Беларусь існуе пакуль я прэзыдэнт*»). Так, можа яшчэ якісь час будзе ягонае цараваньне... Але «белорусов» русскими, аніякі дыктатар ужо не зробіць.
8. Насуперак адкрытай (і прыхаванай) руссификации вялікая колькасьць «белорусов» пачала разумець,што яны Беларусы, а не толькі тутэйшыя, якія жывуць у Беларусі. Так, няма ў нас нацыянальнага чынавенства і ды няма, ці амаль няма Беларускай інтэлігенцыі... Але высілкі асобных інтэлектуалаў-Беларусаў, ціхае

змаганьне за Беларускую мову вялікай колькасьці жыхароў РБ; працяг развіцця Беларускай культуры, літэратурныя творы, Беларускай музыка і беларускамоўныя музыкі, зацікаўленнасьць жыхароў РБ беларускай мовай, гісторыяй, павага, дэманстрацыя і абарона нацыянальных Беларускіх сымбаляў, перадусім Бел - Чырвона-Белага Сьцяга і «Пагоні» - даюць нам надзею, што Беларусь жыве.

ЖЫВЕ Беларусь! - ЖЫВЕ ВЕЧНА!

Як і жыве заклік-пароль так і адказ Кастуся Каліноўскага: « *Каго любіш?*» - *«Люблю БЕЛАРУСЬ!»*

**Пра аўтара: Валеры Грыцук**

Прафесійная дзейнасьць у апошнія 20 год – палітычны аналітык

Адукацыя: курсы псіхалогіі (Менск), школа для мясцовай улады – самакіраваньне (Польшча) , школа Правоў Чалавека (Польшча, HFPCz), курсы («трэнінг) для Адукацыі па Правам Чалавека (Украіна), не скончаная адукацыя юрыдычная (ВНУ), самаадукацыя, з акцэнтам на міжнароднае права.

Грамадская актыўнасць: ад 1978 года ў Апазіцыі да ўлады, да 1989 года далучаўся да ініцыятываў па абароне Беларускай Культуры і Мовы, ад 1989 года ў палітычнай Апазіцыі да небеларускай улады ў Беларусі. Быў Старшынём дэпутацкай Камісіі па захаваньню законнасьці і правоў чалавека, мясцовы Савет, Менск; стваральнік і актывіст шэрагу пазаўрадавых арганізацый (NGO), сярод іх – Фонд імя Льва Сапегі (со-заснавальнік, адзін з кіраўнікоў); Адукацыйны Цэнтр Правоў Чалавека (ініцыятар-заснавальнік, прэзыдэнт).

Аўтар 5 кніг, адна з іх - «Маё змаганьне” (https://kamunikat.org/?pubid=40779), мае старонку на Facebook; Валеры Грыцук аўтар закліка: «ХОЧАМ! МОЖАМ! ПАРАМОЖАМ!» (2006г.), які хрысціяне перарабілі ў «*Верым! Можам! Пераможам!*» і прапанавалі народу Беларусі. Заклік і зараз вельмі папулярны.

**Valery Hrytsuk: Have We Lost Belarus or the Historical Depiction of the 20th Century – the Reign of One Dictator, Former Collective Farm Worker?**
*(webzine “**Kultura. Natsyja**”, issue 29, April 2022, 125-142, www.sakavik.net)*

Respected reader, for 27 years the population of the Republic of Belarus has been asleep (“A Factory of Sleep” – UltraVozhyk), it has made fun of the Opposition, refused to listen to the Opposition. Belarusians have a strong gene for remaining as slaves. But even a slave must think, but Belarusians have not been thinking. I am proposing the theses concerning things that have happened in the Republic of Belarus over the past little while. The situation has improved slightly, but regular workers did not go out on strike which shows that they have remained as slaves. The result is that slaves do not need understanding. Thus, my theses are directed to intellectuals, people who think and whose desire is to rebuild Belarus as a Belarusian democratic state adhering to true rules of people’s civil rights. I show the mistakes of “leaders” among the Opposition, stress that their unwillingness to work for changes through self-sacrifice which has resulted in failures of past efforts. In my view, the most dangerous phenomenon is people’s unwillingness to think for themselves.

**Валерий Грицук: Потеряли ли мы Беларусь или историческая картина XX века – правление одного диктатора, бывшего колхозника?**
*(веб-журнал «Культура. Нация», вып. 29, апрель 2022, 125-142, www.sakavik.net )*

Уважаемый читатель, 27 лет население Республики Беларусь спит («Фабрика сна» - УльтраВожык), высмеивает оппозицию, отказывается слушать оппозицию. У белорусов сильный ген оставаться рабами. Но даже холоп должен думать, а белорусы не думали. Предлагаю тезисы относительно того, что произошло в Республике Беларусь за последнее время. Ситуация немного улучшилась, но рабочие не бастовали, что свидетельствует о том, что они остались рабами. В результате рабы не нуждаются в понимании. Таким образом, мои тезисы адресованы интеллектуалам, людям думающим и желающим восстановить Беларусь как беларусское демократическое государство, придерживающимся истинных норм гражданских прав людей. Я показываю ошибки «лидеров» среди оппозиции, подчеркиваю их нежелание добиваться перемен путем самопожертвования, что привело к провалу прошлых усилий. На мой взгляд, самым опасным явлением является нежелание людей думать самостоятельно.